

**А. Лукашэнка катэгарычна забараніў выкарыстоўваць сельгасугоддзі пад прамысловае будаўніцтва. І нават расказаў гісторыю, як кіраўнік Мінскай вобласці Б. Батура лабіраваў інтарэсы ізраільскіх бізнесоўцаў, а прэзідэнт адмовіў, заявіўшы, перадай «прывет яўрэям». Чаму ж кітайцам іншы прывет, чым яўрэям?  В алерый Карбалевіч, палітолаг**

***У кабінеце вырашалі***

***Вялікаможныя чыны,***

***Каго пусціць сюды з грашамі,***

***Каб падсабілі нам яны.***

Увогуле ахвочых мала

Прынесці нам хоць нейкі грош.

Каб Беларусь прывабнай стала,

Ім трэба даць ільготаў кош.

Ім выдзеліць найперад трэба

Кавалак добрае зямлі

(Дарма, што тоны збожжа-хлеба

На ёй да гэтага раслі).

І каб абсягі той зямліцы

Былі не ў змрочнае глушы,

А недалёка ад сталіцы,

Дзе разгарнуцца ёсць душы.

Каб ім жылося ўежна-гладка

І без турбот дзесяткі год,

Для іх — ні пошлін, ні падаткаў

На ўвесь атрыманы даход.

І гэты ход на дзіва хітры:

У Беларусі з гэтых пор,

Як на Канарах ці на Кіпры,

Уласны мецьмецца афшор.

Ад гэтакіх ільгот здурэе,

Сюды памкнецца цэлы свет!

Найперш кітайцы і яўрэі

Прыйсці выказваюць імпэт.

Каму ж аддаць з іх перавагу,

Каму адрэзаць ладны кус,

Хоць і выказваць будзе звягу

Лапцёжны братка-беларус?

— Аддам яўрэйскаму кагалу

Свой голас важкі, — мовіў чын, —

Бо маюць грошай — да адвалу,

Іх куры не клююць. Прычым

Яны амаль што нашы людзі,

Жылі спрадвеку побач, тут…

Я знаю: толк з яўрэяў будзе!

Хай запрагаюцца ў хамут!

А суразмоўца запярэчыў:

— Што тут жыло яўрэяў шмат,

Дык тое, пэўна, недарэчы,

Не на карысць ім акурат.

Яны тут ведаюць мясціны,

А можа, нават і людзей…

Таму разлік яўрэяў хцівы:

Халява, бач, перападзе…

Разлічваюць: дадзім «на лапу»

Камусьці — і праблем няма.

Ты сам іх, мусіць, ціхай сапай

Лабіруеш не задарма…

— Не маю я сваёй карысці!

Не трэ мне шэкелі-рублі!

А проста чуў, што ў нас калісьці

Яўрэі спраўна рэй вялі.

Вунь і ў Ізраілі кібуцы

Стварылі гэткія — будзь-будзь!

— Твой досвед, дружа, вельмі куцы,

І пра яўрэяў ты забудзь.

А каб не бедавалі дужа,

Ім можаш «перадаць прывет»,

А ў Беларусь, шаноўны дружа,

Нам запрасіць кітайцаў след.

Такая танная рабсіла!

Хоць кожны ростам і малы,

Але да ночы — глянуць міла! —

Яны працуюць, як валы.

А што ім трэба? З рысу каша

Ды штось на цела апрануць.

У іх, кітайцаў, людзі нашы

Няхай павучацца чуць-чуць…

А ты мне кажаш тут — «яўрэі»…

Кітай — наш сябар назаўжды.

Яшчэ й з Паўночнае Карэі

Запросім «спонсараў» сюды.

* * *

А беларус ці ж не гатовы

Карпець на роднае зямлі,

Каб у яго такія ўмовы

І прэферэнцыі былі?

Ды беларуса-недарэку

Не бачаць і ва ўпор чыны.

Хто для начальства ён спрадвеку?

Купалаўскі мужык дурны…

**Алесь НЯЎВЕСЬ**